П.Р.Ігнатовіч, *прафесар*

# КАНТРОЛЬНЫЯ І КУРСАВЫЯ РАБОТЫ ЯК СРОДАК ДАЛУЧЭННЯ СТУДЭНТАЎ ДА САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГАЛІНЕ САЦЫЯЛОГІІ

Галоўнай задачай сучаснай вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне эрудыраванага, ініцыятыўнага творчага спецыяліста, здольнага жыць і працаваць у новы час, час інфармацыйных тэхналогій, пераходу да рынкавых адносін.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Гэта патрабуе ад навучэнцаў не толькі набыцця неабходных ведаў, але і сістэмы ўменняў, навыкаў прымянення іх у жыцці, авалодвання рознымі прыёмамі творчага мыслення і даследавання. Вырашаць гэту задачу можна і патрэбна сумеснымі намаганнямі выкладчыцкага складу і студэнтаў, але спецыфічнымі формамі, метадамі, сродкамі, уласцівымі кожнай вучэбнай дысцыпліне.

Задачы падрыхтоўкі будучых спецыялістаў да самастойнай работы патрабуюць увагі не толькі да прафесійнай дзейнасці, але і да арганізацыйнай, сацыяльна-псіхалагічнай, а таксама светапогляднага боку працэсу падрыхтоўкі спецыяліста. Важная роля належыць тут гуманітарным дысцыплінам. Светапоглядная арыентацыя студэнтаў ВНУ культуры і мастацтва з улікам іх будучай прафесійнай дзейнасці мае асаблівае значэнне.

У мэтах рэалізацыі гэтай патрэбнасці існуе сістэма сродкаў, якая выкарыстоўваецца ў выкладанні гуманітарных навук з мэтай раскрыцця сувязей і ўзаемапранікнення сацыяльна-гуманітарных навук і прафілюючых дысцыплін. Мы засяродзім увагу на выкананні кантрольных і курсавых работ, працы над першакрыніцамі і даведачнымі матэрыяламі. Апошнія могуць разглядацца як у рамках выканання курсавых і кантрольных работ, так і як самастойны від работы.

Па гуманітарных дысцыплінах і канкрэтна па сацыялогіі выкананне кантрольнай работы прадугледжана вучэбным планам для студэнтаў факультэта завочнага навучання.

Самастойная праца студэнта-завочніка па падрыхтоўцы і напісанні кантрольнай работы шматгранная. Яна ўключае выбар тэмы, падбор і вывучэнне літаратуры, у тым ліку першакрыніц, распрацоўку плана работы, напісанне тэксту і афармленне работы.

Такім чынам, выбарам тэмы пачынаецца працэс выканання кантрольнай работы. Безумоўна, гэта работа і выкладчыка, і студэнтаў. Па кожнай вучэбнай дысцыпліне, дзе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прадугледжваецца выкананне студэнтамі кантрольных работ, выкладчыкі распрацоўваюць іх тэматыку; яна абавязкова разглядаецца і зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры, пасля чаго рэкамендуецца студэнтам. Выкладчыкі кафедры сацыялогіі і культуразнаўства маюць пэўны вопыт работы па распрацоўцы тэматыкі кантрольных работ. Яна загадзя паведамляецца студэнтам (перш за ўсё студэнтам ФЗН па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства" ў рэкамендацыях, што змяшчаюцца ў адпаведным зборніку). Кожны студэнт з дапамогай выкладчыка выбірае тэму кантрольнай работы. Дарэчы, тут патрабуецца творчы падыход, і калі студэнт прапануе сваю фармуліроўку тэмы, гэта трэба падтрымліваць.

Пасля выбару тэмы студэнт павінен дэталёва пазнаёміцца з асноўнай і дадатковай літаратурай. Вельмі важнымі з'яўляюцца ўменні працаваць з першакрыніцамі і статыстычнымі матэрыяламі. (Дарэчы, курсавыя работы па сацыялогіі выконваюцца студэнтамі дзённай формы навучання трэцяга курса факультэта культуралогіі.) Асабліва патрэбныя гэтыя ўменні для тых студэнтаў, якія потым будуць займацца навуковай дзейнасцю.

Работа з першакрыніцамі, слоўнікамі, канспектамі, навукова-даведачнай літаратурай разглядаецца як спецыфічная форма арганізацыі творчай работы студэнтаў па засваенні асноў гуманітарных, метадалагічных ведаў. Яна стварае станоўчы эмацыянальна-валявы настрой у студэнтаў у адносінах да авалодвання тэарэтычным узроўнем грамадскай свядомасці, сацыякультурнымі ведамі; раскрывае светапоглядное, метадалагічнае значэнне сацыяльна-філасофскіх, культуралагічных навуковых прынцыпаў у канкрэтнай практычнай дзейнасці. У адзінстве з іншымі формамі навучання работа з першакрыніцамі, слоўнікамі прывівае павагу да сацыяльна-гуманітарных ведаў, павышае агульную культуру мыслення, неабходную для авалодання асаблівасцямі інтэлектуальнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

працы, яе тэхнікай і тэхналогіяй, культурай чытання і маўлення. Чытанне і маўленне ўяўляюцца як праца і творчасць, як сацыяльна значымае і арганізуемае дзеянне. Праз гэтую працу ствараюцца ўстойлівыя каналы міжпрадметных сувязей паміж такімі дысцыплінамі, як сацыялогія культуры, філасофія, паліталогія, этыка, эстэтыка, іншыя грамадскія дысцыпліны.

Работа з першакрыніцамі дазваляе зразумець сутнасць культуры, мастацтва і мастацкай дзейнасці.

Мэты, якія ставіць кафедра, асобны выкладчык, павінны быць зразумелымі для студэнтаў, іх неабходна адаптаваць з улікам узроставых сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей студэнтаў.

Сістэматычная работа з першакрыніцамі дае магчымасць выпрацаваць здольнасць бачыць з'явы ў іх самаразвіцці, праз унутраныя супярэчнасці ў іх адзінстве і ўзаемасувязі. Асноўнае ў рабоце над першакрыніцамі – засваенне навуковых паняццяў. Навуковае паняцце з'яўляецца асноўнай формай лагічнага мыслення. Навуковае паняцце ёсць цэнтральны лагічны элемент навуковай тэорыі, тэарэтычнага ўзроўню свядомасці. Яно ўяўляе найбольш канцэнтраванае выражэнне актыўнай ролі чалавечага розуму ў пазнанні сутнасці навакольнага свету.

Прааналізаваўшы асноўную і дадатковую літаратуру, студэнт атрымлівае поўнае ўяўленне аб змесце тэмы і працягвае работу над ёй. Важнае значэнне мае складанне плана. Правільна вызначыць план работы — гэта значыць выдзеліць галоўнае ў пастаўленай праблеме, абазначыць тыя пытанні, якія неабходна раскрыць. Трэба мець на ўвазе, што план работы нельга перагружаць вялікай колькасцю пытанняў, бо гэта вядзе да павярхоўнага асвятлення тэмы. Часцей за ўсё рэкамендуецца ўключаць у план ад трох да пяці пытанняў.

Пасля гэтага неабходна прыступіць да выкладання зместу тэмы. Безумоўна, галоўнае ў рабоце — яе змест. Але не трэба забываць і пра тое, што да работы прад'яўляюцца пэўныя

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

патрабаванні і па форме. Таму пры напісанні тэксту трэба звярнуць увагу на тое, каб выкладанне матэрыялу вялося ў адпаведнасці з планам, паслядоўна. Як правіла, кожны пункт плана выдзяляецца і ў тэксце работы.

Раскрываючы тэарэтычныя палажэнні, неабходна ілюстраваць іх адпаведным фактычным матэрыялам з першакрыніц. Таму ўжо на падрыхтоўчым этапе трэба ўважліва збіраць матэрыялы, якія неабходны для ілюстрацыі тых ці іншых палажэнняў, але ж пазбягаць перанасычэння работы фактамі, што можа адмоўна адбіцца на аналізе праблемы, абагульненнях і вывадах.

Кантрольная работа адлюстроўвае веданне студэнтам разглядаемай праблемы, уменні аналізаваць, абагульняць тэарэтычны матэрыял і фактычныя даныя па тэме. Выкладанне матэрыялу павінна мець закончаны характар. Разгледзеўшы прадугледжаныя планам пытанні, неабходна сфармуляваць вывады.

Курсавая работа па сваіх задачах, змесце, структуры, падачы матэрыялу ў параўнанні з кантрольнай больш складаная форма самастойнай працы. Яна з'яўляецца вынікам вывучэння пэўнага прадмета і таму павінна ўяўляць сабой не проста выкладанне матэрыялу па тэме, але і прадугледжваць навуковы пошук. Па гэтай прычыне ўскладняюцца патрабаванні як да зместу работы, яе структуры, так і да навукова-даведачнага матэрыялу.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ